# Тэма:

## Прыметнік.
## Сувязь прыметніка з назоўнікам

# Мэты:

- узнавіць і паглыбіць веды вучняў пра прыметнік, яго значэнне і граматычныя прыметы;
- пашырыць уяўленні вучняў пра семантыку прыметніка;
- выпрацоўваць уменні фармуляваць азначэнне прыметніка, вылучаць прыметнікі з тэксту ў складзе словазлучэння, інтанацыйна правільна чытаць словазлучэнні з прыметнікамі ў сказах; выпрацоўваць уменне знаходзіць прыметнікі ў тэксце;
- выхоўваць пачуццё патрыятызму і любові да роднага краю.

# Эпіграф

**Якая асалода – жыць,**
**Знаць вартасць кожнае хвіліны,**
**Тым, што адкрыта даражыць,**
**І адкрываць за дзівам дзіва.**

*В.Вітка*

# Прыпынак «Паэтычны»

**Зямлю беларускую**
**Са сцежкаю вузкаю,**
**З чырвонай рабінаю**
**Заву я любімаю.**
**З  матулінай ласкаю,**
**З бабулінай казкаю**
**На свеце такая адна.**
**Зямля мая ветлая,**
**Азёрамі светлая**
**Барамі гасцінная**
**У сэрцы адзіная.**

*С.Басуматрава*

# Прыметнік

* **Прыметнік –гэта самастойная часціна мовы, якая абазначае прымету прадмета і  адказвае на пытанні  *які? чый?***

# Прыпынак «Паэтычны»

*Падбярыце патрэбныя прыметнікі ў наступны верш:*

**_______________ ты, мой край,**
**Любой парою:**
**_______________ летам, ______________ зімой,**
**Палоніш ______________ сваёй красой.**

# Прыпынак «Сакрэтны»

*Заданне: выберыце тыя назоўнікі, да якіх можна далучыць прыметнікі.*

* **Край, рэспубліка;**
* **Кіно, журы;**
* **Летапіс, медаль;**
* **Соня, ціхоня;**
* **РБ, БДУ.**

# Прыпынак «Загадкавы»

1. **Чырвоная дзюба, чырвоныя пяты, на лузе – цыбаты, у небе – крылаты.**

**2. На лузе браточкі з аднае сямейкі: залатыя вочкі, беленькія вейкі.**

**3. Вісіць – зялёны, ляціць – жоўты, ляжыць – чорны.**

# Прыпынак «Адпачынак»

# Прыпынак «Празаічны»

*Заданне для 1групы*

*Запішыце тэкст, раскрыйце дужкі*

**Мы з вамі нарадзіліся і жывём у Беларусі. На карце яна падобна на (*прыгожая кляновая*) лісток. Жыхары Беларусі – людзі (*гасцінны, працавіты, ветлівы*).(*Суседні*) народ лічыць беларусаў (*сціплы, спакойны*) людзьмі. Нашы продкі насілі (*белы*) адзенне, мелі (*светлы*) валасы.**

# Прыпынак «Празаічны»

*Заданне для 2 групы*

*Запішыце тэкст, замест шматкроп'я падбярыце прыметнікі.*

Колеры нашай зямлі – … і … . Гэта край … лясоў, … азёр; край, куды вяртаюцца з … поўдня … буслы, дзе ў … пушчах пасуцца статкі зуброў. Тут рэкі пояць людзей … вадой, чалавек дыхае … паветрам.

# Прыпынак «Празаічны»

*Заданне для 3 групы*

*Складзіце з наступнымі словамі сказы*

**Бацькаўшчына, Белавежская пушча, Нарач, Ф.Скарына, Янка Купала і Якуб Колас**

# Вывад:

Наш край **прыгожы і непаўторны.**

Мы любім наш **прыгожы і непаўторны** край.

# Прыпынак «Сінтаксічны»

*Выканайце сінтаксічны разбор сказаў*

Наш край **прыгожы** і **непаўторны.**

Мы любім наш **прыгожы** і **непаўторны** край.

# Прыпынак «Прыметнік»

**Я аздабляю нашу мову,**

**Даю прыметы розным словам.**

**Наўрад ці зможаш без мяне ты**

**Прадмет адрозніць ад прадмета.**

# Дамашняе заданне

* Параграф 6, практ. 50